# Архіў
# 2010

## Змест


**Студзень** ... **5**

6 студзеня - Свята Аб'яўлення Пана ... 5

Віншуем праваслаўных братоў з Раством Хрыстовым! ... 5

У Гомельскай вобласці выступаюць царкоўныя хоры з Нямеччыны ... 6

Запрашаем на катэхезы моладзь і дарослых ... 6

У гомельскім касцёле пачаліся катэхезы ... 7

**Люты** ... **8**

Кардынал Казімір Свёнтэк — адзін з трох найстарэйшых кардыналаў у свеце ... 8

40 дзён: пост, малітва, міласціна ... 8

Гомельскія каталікі адзначылі пачатак Вялікага посту пасыпаннем галавы попелам (ФОТА) ... 10

Гомельскі пробашч вярнуўся з падарожжа ў Дамінікану ... 10

**Сакавік** ... **12**

Абвяшчэнне паста ў гомельскім касцеле: свет мае патрэбу ў хрысціянскіх сем'ях 12

Папа Рымскі павіншаваў з імянінамі кардынала Казіміра Свёнтка ... 13

У гомельскай парафіі ўтварылася новая нэакатэхуменальная суполка ... 13

Парафіянка гомельскага касцёла на мяжы жыцця і смерці ... 14

Вялікапосныя духоўныя практыкаванні праходзяць у Гомелі ... 14

Фотарэпартаж святкавання Пальмавай нядзелі ... 15

**Красавік** ... **17**

Святы Трыдуум гомельскія каталікі пачалі з абмывання ног ... 17

Хрыстос уваскрос!!! (ВІДЭА з усяночнай) ... 17

У Пінску адзначылі 71-ю гадавіну святарства Казіміра Свёнтка ... 18

Пачынаюцца парафіяльныя місіі ... 19

Сужэнцаў не выбіраюць, іх дорыць Бог ... 19

"Мужайцеся! Хрыстос уваскрос!" ... 21

Гомельцы атрымалі благаславенне мошчамі Святога Андрэя Баболі ... 21

**Травень** ... **23**

Гомельскія вернікі пабывалі на сустрэчы з заснавальнікамі Неакатэхуменальнага шляху ... 23

Гомельскую парафію наведалі замежныя мецэнаты, якія дапамагаюць будаваць дзіцячы хоспіс ... 23

Гомельскае аддзяленне "Карытас" рэалізуе праграму па навучанню мове жэстаў 24

Дзевяць дзяцей прынялі ў Гомелі першую Камунію (ФОТА) .............................. 25
**Чэрвень** .......................................................................................... **26**
У гомельскім касцёле пачаліся сустрэчы Ананімных Алкаголікаў........................ 26
У Рагачове вернікі аднаўляюць касцёл да яго 100-гадовага юбілея...................... 27
У гомельскім касцёле адбыўся канцэрт царкоўнага хора з Шатландыі.................. 28
Відэа з хрышчэння ў гомельскім касцёле......................................................... 29
**Ліпень** .......................................................................................... **31**
У Будслаўскіх урачыстасцях удзельнічалі 50 гомельцаў (ФОТА) ........................ 31
У Гомелі завяршаецца будаўніцтва дзіцячай вёскі для сірот-інвалідаў................. 31
Міністранты гомельскага касцёла здзейснілі падарожжа па Беларусі.................... 32
Бернардынцы з Літвы распішуць галоўную ікону гомельскага касцёла ................ 34
**Жнівень** .......................................................................................... **35**
Сёстры Маці Тэрэзы праводзяць у Гомелі лагер для дзяцей .............................. 35
У гомельскім касцёле моляцца аб ніспасланні дажджу....................................... 35
У Гомелі пачалі святкаваць 100-годдзе нараджэння Маці Тэрэзы........................ 36
**Верасень** .......................................................................................... **37**
Настаўнікі і вучні атрымалі благаславенне......................................................... 37
У гомельскай парафіі нараджальнасць перамагае смяротнасць ............................ 37
У гомельскім касцёле адзначылі прастольнае свята (ФОТА, ВІДЭА)..................... 38
У гомельскім касцёле распачаўся цыкл сустрэч, прысвечаных адказнаму бацькоўству................................................................................................. 39
**Кастрычнік** .......................................................................................... **40**
Пасол Францыі падчас наведвання гомельскага касцёла: вера - гэта будучыня Беларусі ................................................................................................. 40
У гомельскім касцёле з'явіцца група скаўтаў....................................................... 41
Сакрамэнт бежмавання прынялі больш двух дзесяткаў гомельскіх католікоў (ФОТА).................................................................................................... 41
Віншуем ксяндза-кардынала!............................................................................ 42
**Лістапад** .......................................................................................... **43**
Гомельскія каталікі маліліся на месцы масавых расстрэлаў рэпрэсаваных (ФОТА)43
Віншуем ксяндза-пробашча!............................................................................. 43
Молімся за душу Аляксандра Каралёва ............................................................. 44
Гомельскія каталікі маліліся разам з Папам аб чалавечым жыцці ....................... 44
**Снежань** .......................................................................................... **46**
Запрашаем да ўдзелу ў дыяцэзіяльным конкурсе.................................................. 46

Праз усё жыццё пранеслі веру, перададзеную бацькамі (ФОТА) ............................ 46
У цішыні пачынае гаварыць Бог і паказвае, хто ты ёсць на самой справе ............. 48
У хоспісе для сірот-інвалідаў прыступаюць да добраўпарадкавання дамоў........... 48
Каб тварыць дабро, мець "Lexus" неабавязкова ...................................................... 49
У Гомель упершыню прыбыў Віфлеемскі агонь ....................................................... 50
Раство Хрыстовае ў Гомелі сустрэлі феерверкам..................................................... 50
Свята працягнулася «Бэтлеемкай» ды Калядным канцэртам (ФОТА) .................... 51

# Студзень

## 6 студзеня - Свята Аб'яўлення Пана

*Аўтар: Алесь Белы*
*Дата стварэння: 05.01.2010*



**Свята Трох Каралёў (Аб'яўленне Пана) усталяванае ў гонар падзеі, апісанай у Евангеллі паводле Мацвея: пакланенне магаў дзіцятку Езусу.**

Прыбыўшы ў Ерузалем, каб пакланіцца нованароджанаму Цару Юдэйскаму, яны моцна напалохалі цара Ірада, які бачыў у іх прадказанні найперш з'яўленне прэтэндэнта на сваё царства. Пачуўшы ад кніжнікаў і святароў прароцтва пра меркаванае месца нараджэння Збаўцы (Род 49,10; 1Пар 5,2; Міх 5,2) і ідучы ўслед за зоркай з Усходу, магі прыбылі ў Бэтлеем, і зорка спынілася над месцам, дзе перабывала Св. Сям’я: І, увайшоўшы ў дом, знайшлі Дзіцятка з Марыяй, Маці Яго, і, упаўшы, пакланіліся Яму. Затым, адкрыўшы скарбы свае, ахвяравалі Яму дары: золата, кадзіла і міру. І, атрымаўшы ў сне наказ не вяртацца да Ірада, іншай дарогай вярнуліся ў свой край. Потым, як вядома, былі ўцёкі Св. Сям’і ў Егіпет, забіццё Ірадам немаўлят, і вяртанне ў Назарэт пасля смерці жорсткага тырана.

Поўны тэкст доктара гістарычных навук Алеся Белага аб святе (матэрыял уключае таксама рэцэпты святочных страў) чытайце на ягонай асабістай старонцы ў інтэрнэце.

## Віншуем праваслаўных братоў з Раством Хрыстовым!

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 06.01.2010*



**Гомельская парафія каталіцкага касцёла далучаецца да ўрачыстасцяў Раства праваслаўных вернікаў. Ад усяго сэрца віншуем нашых братоў з праваслаўнай царквы!**

У сваіх малітвах мы будзем памятаць пра іх, і жадаем, каб у гэтым святе Раства браты знайшлі для сябе добрую вестку пра тое, што Ісус увайшоў і ўваходзіць у іх жыццё, каб зрабіць яго сапраўды шчаслівым. Жадаем кожнай сям'і, кожнаму дому блаславення Божага. Як пасля сустрэчы з Езусам тры магі пайшлі іншым шляхам, вяртаючыся ў сваю краіну, так няхай у гэтым новым годзе браты-праваслаўныя таксама ходзяць па шляхах Гасподніх у паслушэнстве Богу і будуць шчаслівымі ў яго любові.

Ўсіх вернікаў просім перадаць самыя цеплыя і сардэчныя віншаванні праваслаўным сваякам, блізкім, знаёмым.

## У Гомельскай вобласці выступаюць царкоўныя хоры з Нямеччыны

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 07.01.2010*



**У гомельскай парафіі Нараджэння Божай Маці падчас ўрачыстай Імшы ў гонар Божага Яўлення (Свята Трох Каралёў) выступілі царкоўныя юныя хоры з нямецкіх гарадоў Гейдэльберг і Фрайбург, а таксама царкоўны акадэмічны хор Гейдэльберга.**

Госці выканалі часткі твора «Missa brevis» Вольфганга Амадэя Моцарта.

Кіраўнік хораў Крыстаф Андрэас Шэфер ад усяго сэрца вітаў гомельскіх каталікоў, адзначыўшы, што 14 дзён таму артысты святкавалі ў Нямеччыне Нараджэнне Хрыстовае, а цяпер «рады працягнуць цудоўныя перажыванні, выступаючы ў Беларусі».

Нямецкія госці працягнуць выступы з «Weihnachtsoratorium» Іагана Себасцьяна Баха («Калядная араторыя», частка 1-3). 7 студзеня ў 19.00 канцэрт пройдзе ў каталіцкім касцёле Рэчыцы, 8 студзеня ў 18.00 - у Гомельскім дзяржаўным каледжы мастацтваў імя Сакалоўскага, а 9 студзеня ў 19.30 запланаваны канцэрт хораў ў Кафедральным каталіцкім саборы Мінска.

Выступы нямецкіх артыстаў суправаджае сімфанічны аркестр каледжа ім. Сакалоўскага. Па запрашэнні навучальнай установы і па ўласнай ініцыятыве госці з Нямеччыны прыбылі ў Беларусь.

*[Фота ў каталозе]*
*[Відэа глядзіце на канале https://www.youtube.com/user/nusmumrikLJ]*

## Запрашаем на катэхезы моладзь і дарослых

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 11.01.2010*



**Мы так часта не ведаем, што рабіць са сваімі слабасцямі, са сваім жыццём, якое не складваецца. Колькі сем'яў пакутуе з-за разводаў, колькі сустракаем выпадкаў сужэнскай нявернасці, алкагалізма ды іншых праблем! Чаму пакуты так глыбока прысутнічаюць у нашым жыцці?**

Не таму, што мы наўмысна робім зло, а з-за таго, што маем вялікую слабасць. Без Бога чалавек вельмі слабы, таму Ісус Хрыстос хоча увайсці ў наша жыццё і даць рэальную дапамогу, з якой мы зможам жыць жыццём новым. Паступова аднаўляючы свае адносіны з Богам і маючы тую сілу, якая ёсць ад Яго, не спадзяваючыся на сябе, чалавек сапраўды зможа жыць па-хрысціянску.

18 студзеня ў гомельскім касцеле (вул. Савецкая, 118) пачынаюцца штогадовыя катэхезы - сустрэчы для дарослых і моладзі, якія будуць праводзіцца ўжо ў 18 раз. Гэта не Набажэнствы і не лекцыі. Катэхезы, на якія запрашаем, адкрываюць шлях узрастання ў веры, набыцці сталай хрысціянскай веры.

«З-за розных абставінаў ў жыцці, у якіх большасць з нас знаходзілася, нам ніхто не перадаваў веры, не вучыў верыць, ніхто не ўводзіў ў таямніцу жыцця хрысціянскай. І тое, што мы маем - гэта часта толькі нейкія азбукі, асобная інфармацыя аб тым, што такое хрысціянства, хто такі хрысціянін, як жыць па-хрысціянску. Большасць у грамадстве мае сваё меркаванне на гэты конт, якое абсалютна не супадае з традыцыяй хрысціянскай. Таму цяжка сказаць аб гэтых людзях, што яны хрысціяне, – **каментуе ксёндз Славамір Ласкоўскі**. – Задума катэхез у тым, каб даць чалавеку штуршок ў руху да шляху хрысціянскага ўзрастання ў веры, на якім мала-памалу, крок за крокам чалавек ці рыхтуецца да хрышчэння, або, будучы хрышчоным, паступова развівае гэты дар».

Запрашаем на катэхезы кожнага, хто б хацеў узрастаць у веры, незалежна ад канфесіі, светапогляду ці сацыяльнага статусу. Дзверы адчынены для ўсіх. Сустрэчы ў касцёле будуць праводзіцца з 18 студзеня па панядзелках і чацвяргах у 19.30.

## У гомельскім касцёле пачаліся катэхезы

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 19.01.2010*



**Традыцыйна 18 студзеня ў гомельскім касцёле пачаліся штогадовыя катэхезы, якія з гэтага часу будуць праводзіцца па панядзелках і чацвяргах у 19.30.**

На першую сустрэчу прыйшлі каля пяцідзесяці гамяльчан. Тым, хто не змог патрапіць на гэтую катэхезу, не варта засмучацца – далучыцца можна ў любы момант.

"Нашы сустрэчы – для ўсіх, незалежна ад канфесіі, светапогляду, вернікаў і атэістаў, нават для ворагаў царквы, калі такія б знайшліся, таму што Гасподзь хоча наблізіцца да кожнага, і свае намеры ў яго ёсць для кожнага чалавека, – прывітаў прысутных кс. Славамір. – Гэтую катэхізацыю будзем рабіць вялікі экіпай, сумесна з нашымі парафіянамі".

На сустрэчах будзе весціся размова аб асновах хрысціянскага вучэння, аб гісторыі выратавання, аб тым, чаму Хрыстос прыйшоў да людзей, і што ў кожнага ёсць магчымасць асабістай сустрэчы з Ісусам Уваскрослым. У працэсе Евангелізацыі чалавек ідзе да таго, каб даведацца, што ён хавае ўнутры сябе і хто ён ёсць на самой справе.

*[Фота ў каталозе]*

## Люты

### Кардынал Казімір Свёнтэк — адзін з трох найстарэйшых кардыналаў у свеце

*Аўтар: Catholic.by*
*Дата стварэння: 12.02.2010*



**Адным з трох найстарэйшых кардыналаў у свеце з’яўляецца Казімір Свёнтэк, арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі на пенсіі, Апостальскі адміністратар Пінскай дыяцэзіі.**

21 кастрычніка 2009 г. беларускаму іерарху споўнілася 95 год. На сённяшні дзень у Калегію кардыналаў уваходзяць 182 члены. 111 з іх не дасягнулі 80-гадовага ўзросту і маюць права выбару Папы. Пры гэтым 81 з іх тытул кардынала быў нададзены Янам Паўлам II, а 30 — Бэнэдыктам XVI.

Сярод тых, каму ўжо 80 і больш гадоў, 4 былі пакліканы да біскупскага служэння папам Паўлам VI, 61 — Янам Паўлам II і 6 — яго наступнікам. Найстарэйшымі кардыналамі з’яўляюцца Пауль Аўгустын Майер, бэнэдыктынец з Германіі (23 мая 1911 г.), італьянец Эрзільё Таніні (20 ліпеня 1914 г.) і беларускі іерарх Казімір Свёнтэк (21 кастрычніка 1914 г.).

Самымі малодшымі кардыналамі з’яўляюцца Пэтэр Эрдо з Венгрыі (25 чэрвеня 1952 г.) і француз Філіп Хаўер Крысціян Ігнацый Барбарэн (17 кастрычніка 1950 г.). Варта нагадаць, што кардынал Філіп Барбарэн у чэрвені 2009 г. прабываў з візітам у нашай краіне па запрашэнні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Кардынал Казімір Свёнтэк — гэта асоба, з якой асацыіруецца адраджэнне Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. Святарскае служэнне Казіміра Свёнтка заўсёды адзначалася незгасальнай энергіяй, самаадданасцю і ахвярнасцю. Наданне ў 1994 г. Казіміру Свёнтку кардынальскай годнасці было прызнаннем заслугаў не толькі таленавітага святара і біскупа, але і мужнага сведкі веры. Пазней, 27 верасня 2004 г., Святы Айцец Ян Павел II уручыў беларускаму іерарху спецыяльную ўзнагароду «Fidei testis» («Сведка веры»), прысуджаную Інстытутам Паўла VI.

Інфармацыя Catholic.by

### 40 дзён: пост, малітва, міласціна

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 15.02.2010*



**У Папялец пачынаецца Вялікі пост. Аб часе, дадзеным нам для чакання Уваскрашэння Езуса Хрыста, і як яго правесці gomel.catholic.by распавёў рэктар міждыяцэзіяльнай вышэйшай духоўнай**

**семінарыі імя Тамаша Аквінскага ў Пінску ксёндз Ян Саламон.**

Пост патрэбны, каб мы, адмаўляючы свайму целу ў задавальненнях, звярнулі ўвагу на духоўны бок нашага жыцця. Езус таксама праводзіў строгі пост, то бок нічога не еў 40 дзён у пустэчы. Пасля гэтага, як кажа Біблія, яго спакушаў д'ябл. Адной са спакусаў быў хлеб. Езус на прапанову паесці адказаў, што «не хлебам адзіным жывы чалавек, а ўсякім Словам, якое ідзе з вуснаў Бога». Сутнасць посту ў тым, што ў нашым штодзённым жыцці мы больш звяртаем увагу на матэрыяльныя рэчы - напрыклад, шукаем задавальнення для цела. А час Вялікага Посту запрашае нас да таго, каб мы больш надавалі ўвагі нашай душы, каб мы больш спадзяваліся на Бога, а не на матэрыяльныя даброты, не на сваю плоць.

Сутнасць гэтага часу, 40 дзён - пост, малітва і міласціна. Гэтыя тры рэчы - як супрацьдзеянне, лекі на нашы тры важныя спакусы, тры вобласці нашай прагнасці. Езуса дэман спакушаў хлебам, то бок задавальненнем для плоці, затым д'ябал абяцаў Яму ўсё багацце, маёмасць свету - калі Езус схіліцца перад д'яблам. Так і чалавек - мы хочам мець розныя задавальненні для свайго цела, не толькі ежу, і мы хочам мець усё больш. І таму на гэтае жаданне задавальнення для плоці супрацьдзеяннем ёсць адмова ад задавальнення, пост. На тое, што мы хочам мець усё больш, набываць ўсё больш, дасягаць сваіх матэрыяльных мэтаў любымі шляхамі супрацьдзеяннем з'яўляецца тое, каб дзяліцца з іншым чалавекам тым, што маеш. На нашу пыху як процідзеянне ёсць малітва - каб мы ведалі, што над намі Бог, што не ўсё ў нашых руках, што мы проста выйшлі з рукі Божай і да Бога ідзем. У малітве чалавек кленчыць перад Богам, мы вызнаем сваю слабасць, залежнасць, разуменне, што мы не маем у сабе крыніцы жыцця, толькі ўсё гэта атрымліваем ад Бога. Малітва - гэта пакора перад Богам.

Усё гэта - пост, малітва, міласэрнасць павінны весці нас да навяртання, каб мы больш былі накіраваныя на выкананне Божай Волі - тое, што пастаянна кажам кожны дзень у малітве «Ойча наш»: «Будзь воля Твая».

Паводле запаведзяў Касцёла, у пост трэба адмовіцца ад забаў. Што тычыцца, да прыкладу, тэлевізара, кампутара, Інтэрнэту - гэта ўсё залежыць ад чалавека, ад таго, што мы шукаем, хочам убачыць у Інтэрнэце, па тэлевізары. Бо ў Інтэрнэце можна знаходзіць карысную інфармацыю, неабходныя веды для вучобы, а можна наведваць Інтэрнэт дзеля грэху. Важна адмовіцца ад усяго не патрэбнага, таго, што аддаляе нас ад Бога, вядзе да граху. Пост служыць нашаму звароту да Бога. У Евангеллі сказана - калі вока цябе спакушае, то вырві яго. Гэта значыць, калі некага спакушае Інтэрнэт, ёсць такая магчымасць адмовіцца ад таго, што спакушае.

Сэнс посту, як яго правесці, трэба тлумачыць дзецям. Сёння ва ўсім свеце шмат людзей галадае, мы павінны дапамагаць адзін аднаму. Напрыклад, грошы, прызначаныя на цырк, кіно, марожанае, цукеркі можна ахвяраваць тым, хто не ў дастатку мае хлеб кожны дзень. Тады будзе больш поўны сэнс гэтага ж паста - што мы эканомім на чымсьці, што нам не трэба для нашага здароўя, без чаго можна жыць, а гэтыя ж грошы можам даць тым, каму не хапае хлеба. Дзяцей прымушаць нешта рабіць не трэба, але неабходна растлумачыць, што дзеля любові да іншых людзей, дзеля любові да Бога можна ў гэты час ад чагосьці адмовіцца.

*[Фота ў каталозе]*

**Гомельскія каталікі адзначылі пачатак Вялікага посту пасыпаннем галавы попелам (ФОТА)**

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 18.02.2010*



**Пачаўся чарговы Вялікі Пост - для некага дзесяты, для кагосьці дваццаты або пяцідзесяты. Але як зрабіць яго не проста ЧАРГОВЫМ?**

Такі ўступ ў сваім казанні зрабіў ксёндз Аляксандр Драбышэўскі, які праводзіў у Папяльцовую сераду ўрачыстую Імшу. Каб будучы Вялікдзень стаў для чалавека сапраўдным святам і вестка аб Хрысце Уваскрэслым была насамрэч радаснай, нам дадзены гэтыя сорак дзён. Дадзены не для сляпога выканання абрадаў або замены смачнага мяса яшчэ больш смачнай рыбай. Гэты дабраславёны час дадзены для нашага навяртання. Трэба ўбачыць сябе грэшным і прыняць гэта. У іншым выпадку - калі мы не грэшныя - увесь Новы Запавет з'яўляецца падманам. І Хрысту не патрэбна паміраць і ўваскрасаць з мёртвых.

Чытачам сайта прапануем фотаздымкі з традыцыйнага пасыпання галавы попелам.

*[Фота ў каталозе]*

**Гомельскі пробашч вярнуўся з падарожжа ў Дамінікану**

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 28.02.2010*



**Тры тыдні правёў кс. Славамір на далёкай ад Беларусі выспе сярод Атлантычнага акіяна. У Дамініканскую рэспубліку - каталіцкую краіну - яго запрасіў іспанскі сябар кс. Сальвадор.**

Ён служыць рэктарам духоўнай семінарыі ў Санта-Дамінга. Некалькі гадоў таму гомельскія парафіяне сустракаліся з кс. Сальвадорам: ён прыязджаў у якасці вандроўнага катэхіста.

У Дамінікане кс. Славамір ўдзельнічаў у набажэнствах у мясцовых парафіях, сустракаўся з Папскім Нунцыям і сем'ямі місіянераў, наведваў духоўную семінарыю. У «Redemptoris Mater» вучацца будучыя місіянэры, якія з'язджаюць потым у розныя куткі свету, ёсць тут і яшчэ адна духоўная семінарыя, што рыхтуе служыцеляў для мясцовых храмаў. Нагадаем, што евангелізацыя Дамініканы пачалася ўжо з 1492 года, пасля прыбыцця сюды Хрыстафора Калумба.

«Так што каталіцызм там развіваецца яшчэ з XV стагоддзя і моцна ўвайшоў у структуры жыцця гэтай краіны, - распавядае кс. Славамір. - Не так даўно ў Дамінікане ўздымалася пытанне аб змяненнях маральных аспектаў жыцця, да прыкладу, аб дазволе абортаў. Але парламент прыняў закон супраць абортаў. Гэта адна з нямногіх краін свету, дзе афіцыйна яны забароненыя. Як глыбока хрысціянскі

менталітэт ў гэтых людзях! Яны думаюць па-хрысціянску. Ва ўсіх сферах жыцця Дамінікaны ёсць прысутнасць Царквы, прыкметна, што яна рэальна ўплывае на грамадства - не так, як у нашай краіне».

Мы папрасілі кс. Славаміра больш падрабязна расказаць пра братоў-дамініканцаў: «Там людзі вельмі адкрытыя, дабразычлівыя, гасцінныя. Многія бедныя, але гэта не перашкаджае ім жыць радасна і ўсведамляць сябе шчаслівымі. Галеча іх не гняце. Яны не адчуваюць сябе прыніжанымі, ўмеюць радавацца таму жыццю, якое маюць». Адна з самых характэрных рысаў дамініканцаў - шматдзетныя сем'і. Незалежна ад статусу ў грамадстве або эканамічнага фактару яны сапраўды любяць сваіх дзяцей і прымаюць іх. У гэтым таксама бачная вялікая розніца з нашай краінай. Дамінікaна па тэрыторыі ў шэсць разоў менш Беларусі, але мае прыкладна столькі ж жыхароў.

Цікава, што адна з місіянерскі сем'яў, з якімі сустракаўся кс. Славамір, жыве ў Уругваі і мае сем дзяцей. Другая сям'я пасялілася ў Порт-а-Прэнс (сталіцы Гаіці), там, дзе быў землятрус. У момант катастрофы сям'я як раз знаходзілася ў горадзе, але з ёй абсалютна нічога не здарылася.

«Гаіці мае зусім іншы лад жыцця, чым Дамінікaна. Адна выспа, але дзве розныя краіны. Паміж імі велізарная бездань. У Гаіці вялікая беднасць, маральнае дно, распуста, абсалютная беззаконне. Ніякімі меркамі гэта не вымерaць, каб зразумець, што там адбываецца. Вельмі моцны ўплыў мае на гэтых людзей рэлігія Вуду, сумесь афрыканскіх плыняў, рэлігійны вінегрэт, які заганяе людзей у страх і залежнасць ад шаманаў. Можна сказаць нават адкрытым тэкстам, што гэтыя людзі знаходзяцца пад уплывам дэмана. Вельмі небяспечная краіна», - канстатаваў кс. Славамір.

Мы спыталі ў пробашча, што атрымаў ён з гэтай паездкі ў дачыненні да яго служэння ў Гомелі:

«Для мяне стала яшчэ больш відавочна, што шлях евангелізацыі і развіцця сямейных каштоўнасцяў не памылковы. Бачачы дамініканцаў, я ўмацаваўся ў думцы, што сям'я - гэта фундамент для грамадства, таму незалежна нават ад эканамічнага ўзроўню развіцця Дамініканская рэспубліка вельмі моцная сваімі сем'ямі. Усё больш разумею, што трэба запрашаць у Царкву моладзь, сямейныя пары, абіраючы для нашай парафіі сямейны накірунак».

*[Фота ў каталозе]*

# Сакавік

## Абвяшчэнне паста ў гомельскім касцеле: свет мае патрэбу ў хрысціянскіх сем'ях

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 03.03.2010*



**3 сакавіка пробашч храма кс.Славамір і катэхісты правялі Абвяшчэнне паста для нэакатэхуменальных суполак, а для катэхістаў гэта зрабіў 10 лютага ў Рыме заснавальнік Нэакатэхуменальнага шляху Кіка Аргуэлья.**

Кс.Славамір нагадаў аб вялізарнай ролі сям'і ў сучасным свеце, які ўсё больш падвяргаецца секулярызацыі і дэхрысціянізацыі. У некаторых еўрапейскіх дзяржавах прымаюцца такія законы, якія ствараюць пагрозу існавання сем'яў, знішчаюць іх. Да прыкладу, у школах прымушаюць дзяцей ўдзельнічаць у занятках, на якіх абвяшчаюць паганскі менталітэт. Бацькі-хрысціяне вымушаныя пераводзіць дзяцей у іншыя школы або наогул не пускаць на заняткі. У сучасным свеце хрысціянскія сям'і адчуваюць страшэнны ціск.

Калі верыць праведзеным даследванням, не выключана магчымасць таго, што праз нейкіх трыццаць гадоў Еўропа стане мусульманскай. «У нашым грамадстве не хапае мільёнаў дзяцей. Іх забілі праз аборты», - падкрэсліў пробашч. Ён звярнуў увагу, што ў сусветнае грамадства, яшчэ з 19-га стагоддзя ўвайшла велізная хлусня аб тым, што трэба кантраляваць нараджальнасць, бо ежы на ўсіх не хопіць, людзей занадта шмат. «Многія паддаліся гэтай хлусні, паверылі ў гэта. Як вынік - аборты, сем'і, якія не хочуць мець больш аднаго ці двух дзяцей», - канстатаваў кс.Славамір. Ён заклікаў прысутных жыць па-хрысціянску, а гэта значыць - выконваць волю Бога, быць адкрытымі для новага жыцця.

Пробашч нагадаў, што чалавек не можа станавіцца хрысціянінам, каб жыць для сябе. «Гэта немагчыма. Таму што Ісус сказаў, што Ён прыйшоў выканаць не сваю волю, а волю Айца. Ісус казаў: Любіце адзін аднаго, як я палюбіў вас», - нагадаў кс.Славамір.

Прысутным былі прадэманстраваны відэаролікі з маніфэстацыі сем'яў у Мадрыдзе. З мэтай узьнесці хвалу Богу, яго перамогу ў жыцці хрысціян 27 снежня 2009 у літургічнае свята Святой Сям'і ў Мадрыдзе прайшоў Дзень Сем'і. У сталіцу Іспаніі з'ехаліся каля мільёна чалавек, большая частка якіх - сем'і з суполак Нэакатэхуменальнага Шляху. Сустрэча праходзіла на плошчы Плаза дэ Ліма, на якой Папа Ян Павел Другі падчас свайго візіту ў Мадрыд ў 1982 годзе заявіў, што «будучыня чалавецтва праходзіць праз хрысціянскую сям'ю». Удзельнікаў сустрэчы - сем'і з Італіі, Іспаніі, Польшчы, Чэхіі, Германіі і іншых краін (у тым ліку Беларусі) віталі кардыналы і біскупы, кіраўнікі папскіх Саветаў.

Падчас казання кардынал Мадрыда Антоніа Марыя Роўка Варэла нагадаў аб цяперашнім становішчы сям'і і падкрэсліў, што «ў сучасны вобраз мыслення ўкараняюцца новыя мадэлі суіснавання, якія, аднак, не здольныя вырашыць праблемы сям'і. Толькі ў хрысціянскай сям'і, вобразе Святой Сям'і з Назарэта, дзеці, хворыя, інваліды адкрываюць для сябе дар жыцця. Хрысціянская сям'я з'яўляецца святыняй грамадства. Без яе Еўропа засталася б без дзяцей і без будучыні, поўнай любові».

І яшчэ: у ранніх хрысціян не было месцаў, дзе яны маглі б сустракацца, збірацца для малітвы. Людзі пазнавалі хрысціянаў па іх жыццю, па працы, па іх сем'ях. Да гэтага ж заклікае кс.Славамір і гомельскіх парафіянаў.
*[Фота ў каталозе]*

## Папа Рымскі павіншаваў з імянінамі кардынала Казіміра Свёнтка

*Аўтар: Catholic.by*
*Дата стварэння: 08.03.2010*



**Кардынал Казімір Свёнтэк, арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі на пенсіі, Апостальскі Адміністратар Пінскай дыяцэзіі, атрымаў віншаванні з нагоды сваіх імянінаў ад папы Бэнэдыкта XVI, Дзяржаўнага сакратара Яго Святасці кардынала Тарчызіо Бэртонэ і намесніка дзяржсакратара арцыбіскупа Фернандо Філоні.**

«З нагоды ўрачыстасці імянінаў дасылаю Вашай Эмінэнцыі шчырыя пажаданні і выказваю духоўную лучнасць, — чытаем у тэлеграме Святога Айца. — Праз пасрэдніцтва святога Казіміра прашу аб шчодрых Божых ласках і з сэрца ўдзяляю апостальскае благаслаўленне, агортваючы ім блізкіх і супрацоўнікаў ксяндза кардынала, а таксама ўсіх даверанных яго пастырскаму клопату».

«У радасны дзень імянінаў прашу прыняць шчырыя пажаданні і віншаванні, якія падтрымліваю асабліваю малітвай у інтэнцыі ксяндза кардынала», — цытуе тэлеграму кардынала Тарчызіо Бэртонэ партал Catholic.by

## У гомельскай парафіі ўтварылася новая нэакатэхуменальная суполка

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 14.03.2010*



**На нядзельнай Эўхарыстыі ў гомельскім касцёле Нараджэння Божай Маці ўрачыста віталі новую нэакатэхуменальную суполку. Яна ўтварылася пасля заканчэння катэхез, якія праходзілі ў храме ў студзені-сакавіку 2010 года.**

Цяпер у касцёле стала сем суполак. Неэкатэхуменальны шлях быў адкрыты ў парафіі каля 20 гадоў таму, менавіта такі ўзрост мае першая гомельская суполка.

Тыя, што сабраліся на Эўхарыстыі пачулі ў Евангеллі вядомую прыпавесць пра блуднага сына. Падчас казання пробашч касцёла кс. Славамір заўважыў, што ў новай суполцы, як і ва ўсёй царкве, ёсць і малодшыя блудны сыны, і тыя, хто адпавядае вобразу старэйшага сына - прыстойнага чалавека. Але кожны з іх мае патрэбу ў навяртанні, бо з'яўляецца эгаістам і жыве толькі для сябе. Дзякуючы сустрэчы з Ісусам чалавек можа атрымаць новае жыццё і сапраўды стаць хрысціянінам: тым, хто робіць справы Божыя. Так жа, як і Хрыстос, які прыйшоў на зямлю выканаць волю Айца.

Дарэчы, новыя суполкі ў гэтую нядзелю павінны ўтварыцца на канвівенцыях пад Светлагорскам, а таксама ў Латвіі, дзе евангелізацыю разам з іншымі братамі праводзіў гамяльчанін Мікалай Ермакоў.

*[Фота ў каталозе]*

### Парафіянка гомельскага касцёла на мяжы жыцця і смерці

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 20.03.2010*

**Маладая дзяўчына Марына, парафіянка гомельскага касцёла, ужо тры тыдні знаходзіцца ў коме. Яна трапіла ў гарадскую бальніцу № 3 з двухбаковым запаленнем лёгкіх.**

Да таго ж дзяўчына хварэе цяжкай формай цукровага дыябету, што яшчэ больш пагаршае яе стан. Доўгі час Марына знаходзілася пад апаратам штучнага дыхання, нядаўна лекары яго знялі і дзяўчына дыхае сама. Але са стану комы па-ранейшаму не выходзіць. Дактары кажуць, што шанцаў выжыць у Марыны практычна няма, застаецца верыць у цуд.

Сябры і сваякі заклікаюць маліцца за гомельскую парафіянку, за яе папраўку. Пане Божа, мы просім, каб Марына вярнулася да нас, але няхай споўніцца Воля Твая.

### Вялікапосныя духоўныя практыкаванні праходзяць у Гомелі

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 22.03.2010*



**Да 23 сакавіка Вялікапосныя духоўныя практыкаванні праводзіць у Гомелі выкладчык Пінскай семінарыі ксёндз Эдуард Мігай.**

У нядзелю ён патлумачыў парафіянам пяць памылак аб блізкасці да Бога.

**Першае з іх такое:** галоўнае - гэта тое, што Бог робіць для мяне. Чалавек можа думаць, што калі ён моліцца, ходзіць у касцёл, дык Гасподзь яму нешта абавязаны. Тады з размовы з Богам малітва ператвараецца ў заклён, вядзьмарства. Але Госпада немагчыма прымусіць нешта зрабіць. Ён Сам вырашае, як паступаць. У імкненні да Бога важна думаць не пра тое, што мы можам атрымаць, а чым можам паслужыць Госпаду, што можам зрабіць для Яго. Кс. Эдуард згадаў, як у адным з запаведнікаў, дзе жывуць

мядзведзі Грызлі, уздоўж дарогі развесілі надпісы: не карміце мядзведзяў! Таму што яны гінуць. І як ні дзіўна ад голаду. Жывёлы перастаюць лазіць па дрэвах, шукаць сабе ежу, а толькі сядзяць каля дарогі і чакаюць чарговай падачкі ад турыстаў. Так паступаюць і некаторыя людзі, якія толькі сядзяць і чакаюць падачак ад Бога.

Ксёндз падкрэсліў, што чалавеку важна чытаць Біблію кожны дзень. Гэта ёсць інструкцыя да шчаслівага жыцця чалавека: «На самой справе жыць паводле запаведзяў лёгка. Цяжка жыць, не захоўваючы іх. Людзям, якія так паступаюць, не варта здзіўляцца, што яны часта адчуваюць сябе сумнымі, засмучанымі, нешчаслівымі. Як казаў Папа Бэнэдыкт XVI на сустрэчы ў Кёльне: «Калі ты лічыш сябе веруючым чалавекам, знайдзі суполку вернікаў і увайдзі ў яе, каб умацоўваць сваю веру». Таму што свет можа яе толькі знішчыць. Свету не патрэбныя веруючыя людзі, яму патрэбныя толькі тыя, якія хочуць усе адразу і прама зараз».

**Другі зман:** Другое зман: адносіны з Богам - гэта нефармальныя прыяцельскія стасункі. Неабходна ўсведамляць магутнасць і веліч Госпада, адчуваць багавейнасць і трымценне перад ім. Узгадаем аб зносінах з Богам Майсея. Кс. Эдуард звярнуў увагу і на паводзіны вернікаў у храме. Прыхіленне каленаў павінна быць менавіта прыхіленнем, а не падабенствам рэверанса. «Гэта, вядома, не трэба Госпаду, а трэба табе і іншым людзям, якія глядзяць на цябе і чакаюць сведчанняў».

**Зман трэці:** досвед зносінаў з Богам аднолькавы для ўсіх. Не варта ўказваць іншым, што ён неяк не так сябе паводзіць, няправільна вядзе стасункі з Панам. У кожнага свой шлях. Узгадаем Апосталаў. Як прыйшоў да Бога Пётр, а як Павал. Ці Фама, да якога Ісус прыходзіў, каб той ўклаў свае пальцы ў Яго раны. Іншым людзям мы павінны казаць толькі тое, што неабходна шукаць Бога.

**Чацвертая памылка:** мы можам адчуць поўныя зносіны з Госпадам тут і зараз. Ні падчас асабістай малітвы, ні на Эўхарыстыі мы не можам цалкам спазнаць Бога. На гэта здольная толькі нашая душа пасля смерці. Так жа, як на моры мы бачым толькі частку хвалі. Нашае жыццё не дазваляе ўбачыць усё хараство Божае.

**І пяты зман:** зносіны з Богам магчымыя пры частковым пасвячэнні яму жыцця. Памыляюцца тыя, хто думае: я аддаю Госпаду адну гадзіну ў тыдзень падчас прысутнасці на Імшы. Астатні час - мой, я сам сабе бог. Выпадковых сувязяў з Панам не можа быць у хрысціяніна. Вернік - не той, чые жыццё праходзіць паралельна з жыццём Бога па прынцыпе «кожны сам па сабе, адзін аднаму не перашкаджае». Святы чалавек - не той, хто адчувае на службах рэлігійнае захапленне, мілуецца спевамі царкоўнага хору. Святы - той, хто грашыць і знаходзіць у сабе сілы ўздымацца і каяцца ў сваіх грахах.

*[Фота ў каталозе]*

## Фотарэпартаж святкавання Пальмавай нядзелі

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 28.03.2010*



**Гомельскія каталікі пачалі адзначаць Пальмавую нядзелю ў дзевяць раніцы, сабраўшыся перад уваходам у храм з галінкамі папараці ды вербы.**

Пробашч зачытаў Евангелле ад Лукі аб прыбыцці Хрыста ў Ерусалім і асвяціў пальмовыя і вербавыя галіны.

Кс. Славамір адзначыў, што не варта ставіцца да гэтага абраду па-язычніцку: асвячэнне галін - гэта не якое-небудзь шаманства. Не галіны ахоўваюць дом і сям'ю парафіянаў, а Гасподзь, які чакае нашага навяртання. «Свет і сёння мае патрэбу ў вучнях Езуса. Тых, якія не ставяць галоўным у сваім жыцці якую-небудзь ідэалогію ці кавалак хлеба. Тых, якія вызнаюць сваю веру заўсёды і ўсюды. Якія добрасумленна працуюць і адстойваюць справядлівасць, змагаюцца на баку людзей, з якімі несумленна абышліся. Тых, якія не хаваюцца за хлуснёй», - сказаў пробашч.
*[Фота ў каталозе]*

# Красавік

## Святы Трыдуум гомельскія каталікі пачалі з абмывання ног

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 01.04.2010*



**У службе Вялікага чацвярга ўдзельнічалі чатыры святара: пробашч ксёндз Славамір, а таксама кс. Аляксандр, кс. Луіджы і рэктар Пінскай духоўнай семінарыі кс. Ян Саламон.**

«Гэта момант ўстанаўлення Эўхарыстыі і святарства. Мы павінны разумець, што гэта адбываецца дзеля таго, каб мы змаглі атрымаць дар любові, з дапамогай якой будзем служыць для іншых. Яе нельга здабыць ўласнымі сіламі, яна даступная тым, хто адкрывае сваё жыццё для Хрыста, дазваляючы Яму абмыць сябе», - прамовіў на казанні пробашч. Пасля чаго перад алтаром былі пастаўленыя крэслы, на якія селі дванаццаць парафіян і разуліся, каб ксёндз абмыў іх ногі.

Пасля Імшы з «прафесійным святам» парафіяне павіншавалі чатырох святароў. Кс. Славамір адзначыў, што хоча называць сваю працу не прафесіяй, а сапраўдны служэннем.

*[Фота ў каталозе]*

## Хрыстос уваскрос!!! (ВІДЭА з усяночнай)

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 04.04.2010*



**У гомельскім касцёле Пасхальнае чуванне працягвалася з дзесяці вечара да трох гадзін раніцы, калі пад песню званоў парафіяне здзейснілі вакол храма хрэсны ход, абвяшчаючы Уваскрасенне Езуса.**

А пачалося чуванне з Літургіі святла, у гэты час у касцёле выключылі лямпы, пакінуўшы вернікаў у цемры як сімвале смерці, якую прыносіць грэх. Праз некалькі хвілін храм азорыла святло Велікоднай свечкі, ад яе пробашч перадаў вернікам, якія трымалі ў руках свечкі, агонь - знак жыцця, якое ў сваёй любові дае нам Хрыстос.

Падчас казання ксёндз Аляксандр Драбышэўскі асабліва адзначыў, што з'яўляецца для чалавека самым страшным у гэтую ноч: «Не тое, што ў цябе поўна грахоў і што ты не ўмееш любіць. Самае страшнае - застацца абыякавым да таго, што адбываецца.

Да гэтай падзеі, Пасхальны падзеі. Як апосталы, якія адразу не паверылі жанчынам, што распавялі пра Уваскрасенне Госпада, палічыўшы іх словы пустымі. І нам у гэтую ноч небяспечна застацца абыякавымі і палічыць усе тое, што адбываецца, пустым, быць чужым гледачом, як у тэатры. Таму што чалавек, які

застаецца абыякавым, працягвае знаходзіцца ў смерці. Бо гэтай ноччу Гасподзь вырывае нас са смерці, хоча перамагчы нашага ворага. Сённяшняй ноччу Пан перамог, вырваў нас з рабства. Астатнія святы ў параўнанні з гэтай ноччу - нішто. Важна глядзець сёння не на сябе, не на свой грэх,назіраць не яго, а Хрыста Уваскрэслага. Перамога ў ім! Важна не марнаваць надзеі. Гэты Вялікдзень для грэшнікаў, для чалавека, які адчувае сябе слабым, бездапаможным. Страціць надзею - значыць страціць Бога».

Ад імя гомельскіх каталікоў віншуем з Уваскрэсеннем Хрыстовым праваслаўных братоў, пратэстантаў, а таксама габрэяў - старэйшых братоў па веры, якія на некалькі дзён раней пачалі адзначаць Вялікдзень. Наведвальнікам сайта прапануем кароткія відэаролікі з ўсяночнага чування.

*[Фота ў каталозе]*
*[Відэа глядзіце на канале https://www.youtube.com/user/nusmumrikLJ]*

## У Пінску адзначылі 71-ю гадавіну святарства Казіміра Свёнтка

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 08.04.2010*



**8 красавіка дэлегацыя гомельскага дэканата накіравалася ў Пінск, каб павіншаваць з 71-й гадавінай святарства Апостальскага адміністратара Пінскай дыяцэзіі ксяндза-кардынала Казіміра Свёнтка.**

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел пробашчы парафій у Рэчыцы і Рагачове кс. Яцэк і кс. Андрэй, а таксама дэкан гомельскага дэканата кс. Славамір і сёстры ордэна міласэрнасці Маці Тэрэзы.

Пробашч гомельскай парафіі распавёў пра свята: «У самым пачатку Імшы, на якой сабралося больш за 30 святароў, а таксама манашак і простых вернікаў, прагучалі віншаванні ў адрас ксяндза-кардынала. Святары паднеслі кс. Казіміру 71 ружу. Кардынала павіншавалі маладыя вернікі, а таксама рэктар Пінскай духоўнай семінарыі Ян Саламон.

У адказ Апостальскі адміністратар сказаў, што дзякуе Пану Богу за дар паклікання, за дар жыцця, якое атрымаў ад маці, і якая з дзяцінства займалася яго рэлігійным выхаваннем. Таксама кс. Казімір дзякаваў Богу за ўвесь плён свайго святарства, і як за радасныя, так і за цяжкія моманты жыцця, калі быў у лагерах і турмах. Яшчэ кардынал падкрэсліў, што вельмі ўдзячны Божай Маці за апеку падчас усяго свайго жыцця. На ўрачыстасцях прысутнічалі паслушнікі Пінскай духоўнай семінарыі. Да іх напрыканцы звярнуўся кс. Казімір. Ён адзначыў: вельмі важна памятаць пра адданасць Госпада, калі Ён паклікае, то вядзе праз усё жыццё».

Потым пачалася Святая Імша, якую вёў Апостальскі адміністратар. Пасля Набажэнства ўсе спусціліся да магілы слугі Божага, біскупа Зігмунда Лазінскага. Кардынал у які раз дзякаваў яму за тое, што суправаджае ва ўсе гады святарства, хоць кс. Казімір ніколі і не бачыў біскупа. Але ў юнацтве Казімір Свёнтэк маліўся ля труны Лазінскага і там адчуў пакліканне да святарства.

**Пачынаюцца парафіяльныя місіі**

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 11.04.2010*



**З 11 красавіка госці з Ордэна Капуцынаў праводзяць у гомельскім касцёле 8-дзённыя парафіяльныя місіі.**

Увесь тыдзень кожны дзень з вернікамі будуць сустракацца пробашч каталіцкай парафіі ў Слоніме ксендз Андрэй, а таксама айцец Арыюш з Маладзечна, які ўжо добра знаёмы гомельскім вернікам.

Расклад і тэмы сустрэч:

**Дзень першы**. ПАЛОН І ПАСХА – Я Гасподзь, Бог твой, які вывеў цябе з зямлі Егіпецкай, з дома рабства. ТАК НЕ БУДЗЕ Ў ЦЯБЕ ІНШЫХ БАГОЎ, АКРАМЯ МЯНЕ – акт адданасці Божай Маці.

**Дзень другі**. СТВАРЭННЕ – НЕ ПРАМАЎЛЯЙ ІМЯ ПАНА, БОГА ТВАЙГО ДАРЭМНА – Набажэнства аб пакліканнях.

**Дзень трэці**. ГРЭХ – НЕ ЗАБІВАЙ – Набажэнства аб памерлых.

**Дзень чацверты**. САЮЗ-ЗАПАВЕТ З АБРАГАМАМ – ПАВАЖАЙ БАЦЬКУ ТВАЙГО І МАЦІ ТВАЮ – Набажэнства для сем'яў, абнаўленне шлюбных клятваў.

**Дзень пяты**. САЮЗ-ЗАПАВЕТ НА СІНАІ — НЕ КРАДЗІ – Набажэнства аб цвярозасці.

**Дзень шосты**. ПУСТЫНЯ – СПАКУСЫ – НЕ ПАЖАДАЙ І НЕ ЧУЖАЛОЖ (VI, IX, X) – літургія пакаяння.

**Дзень семы**. СКРУЦІНІЯ – НЕ ПРАМАЎЛЯЙ ІЛЖЫВАГА СВЕДЧАННЯ – сакрамэнт аб хворых.

**Дзень восьмы**. УВАХОД У АБЯЦАНУЮ ЗЯМЛЮ – ХРОСТ – ПАМЯТАЙ ДЗЕНЬ СВЯТЫ СВЯТКАВАЦЬ – абнаўленне хрысцільных клятваў.

**Нядзеля, панядзелак, аўторак** – у 20.30 СУСТРЭЧЫ ДЛЯ МОЛАДЗІ

**Панядзелак, аўторак** – в 15.30 СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Серада, чацвер** – в 20.30 СУСТРЭЧЫ ДЛЯ СУЖЭНЦАЎ

**Сужэнцаў не выбіраюць, іх дорыць Бог**

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 15.04.2010*



**У гомельскім касцёле працягваюцца парафіяльныя місіі. У сераду кс. Арыюш Малыска з Ордэна Капуцынаў, пробашч рымска-каталіцкай парафіі ў Маладэчна правёў сустрэчу для сужэнцаў.**

Дзесяткі пар розных узростаў сабраліся ўвечары ў касцёле. Для тых, хто не змог пабываць на сустрэчы, прыводзім вытрымкі з казання для сужэнцаў кс. Арыюша.

Сужэнства - гэта Божы цуд. Імкненне мець мужа ці жонку здаецца натуральным. Але на самой справе мікракосмасы мужчыны і жанчыны цалкам

розныя, і аб'яднаць іх у адно цела і адзін дух, як сказана ў Бібліі, не так проста. Калі людзі становяцца сужэнцамі, думаецца, што яны прымаюць гэтую ахвяру. Але яна доўжыцца месяц, год, а далей у ахвяру сужэнцы часта прыносяць адзін аднаго.

Справа ў тым, што чалавек створаны адзінокім. Адзіным, непаўторным, але і адзінокім. І часам здаецца, гледзячы на чужога мужа ці чужую жонку, што было лепш выбраць для сумеснага жыцця каго-небудзь іншага: з ім ці з ёй жыццё было б больш шчаслівым. Узнікае спакуса выходзіць са сваёй адзіноты праз цела. Але гэта немагчыма. Адзінота звязана не з целам. Хтосьці будзе сядзець адзін у доме і не адчуваць сябе адзінокім. А нехта будзе знаходзіцца ў натоўпе людзей і ўсведамляць сябе зусім адзінокім. Адзінота звязана з унутраным светам чалавека. Альбо ён зачынены і знаходзіцца сам-насам са сваімі праблемамі, альбо адкрыты і адарае сабой - рабіць гэтага нікому не хочацца.

Маладыя людзі сёння адчуваюць сябе самотнымі. Іх сяброўства мае віртуальны характар. Яны размаўляюць адзін з адным праз смс, праз інтэрнэт. Яны кажуць: я маю ў інтэрнэце 300 сяброў! Але якія ж гэта сябры? Ўступіць у нармальныя чалавечыя персанальныя адносіны цяжка, таму што настае адказнасць. Моладзь гэтага баіцца і трымаецца на адлегласці - каля кампутара ці мабільнага тэлефона. Тыя бацькі, якія ў сродках віртуальных стасункаў абмяжоўваюць сваіх дзяцей, абараняюць іх ад многіх спакусаў. Шматлікія святары пакінулі святарства з-за таго, што ёсць інтэрнэт. Таму што ўвайшлі ў віртуальны кантакт, і хтосьці прапанаваў ім выйсці з адзіноты праз цела. Неймаверная колькасць мужоў змяняюць сваім жонкам дзякуючы кампутару. Дамаўляюцца, сустракаюцца і разыходзяцца. І чым часцей гэта паўтараецца, тым цяжэй становіцца, адзінота толькі пагаршаецца. І калі нарачоныя з самага пачатку пазнаюць адзін аднаго праз цела, то яны як бы дастаюць кнігу з самай высокай паліцы. З ніжніх паліц браць кнігі ўжо не хочацца - не цікава. І калі трэба пагаварыць, абмеркаваць праблему, то такія сужэнцы замест размовы цалуюцца і ідуць у ложак. Не дзіўна, што такія пары хутка разводзяцца. Спачатку трэба спазнаць чалавека, а потым яго цела. Якое першае пытанне задаваць хлопцу, калі ён сустракаецца з дзяўчынай - ці можа яна быць маці маіх дзяцей. Калі не - то не чапай яе. Гэта не компот, які можна паспрабаваць. Жонку дае Бог. Калі бачыш, што гэта так, то ідзі за ёй.

Людзі якія пражылі ў шлюбе шмат гадоў, часта становяцца адзін аднаму не цікавымі. Многім здаецца, што гэта яны выбіраюць сваю другую палавінку. Я выбіраў яе, а яна выбірала мяне. Гэта не праўда. Бог падараваў табе яе. І гэта лепшая жонка, якую ты можаш мець. Таму што іншая знішчыла б цябе. А гэтая знішчае, але не забівае :) Камусьці здаецца, што муж-п'яніца - гэта праклён. Але думаецца: я хрысціянка, каталічка, таму як-небудзь пацярплю. Гэта значыць, што яна нічога не зразумела аб Божай волі для сябе. Але гэта лепшы муж, які ў цябе можа быць. Бог табе яго падарыў. Таму што быў бы іншы муж, які клапаціўся б пра цябе, не піў, то ты думала б, што такая добрая, такая праведная, і што Бог табе не патрэбны. Калі маеце праблему адзін з адным, не згаджаецеся, сварацеся, то першае пытанне: чаго ты хочаш ад яе ці ад яго? Каб ён або яна сталі вобразам, які сабе намаляваў? Гэта азначае, што ты маеш прэтэнзію да Бога. Мы чакаем зменаў ад іншых, але не хочам

змяняцца самі. Таму трэба звяртацца да Госпада, напаўняцца Ім, шукаць Яго, слухаць Слова.

У канцы сустрэчы сужэнскія пары ўрачыста абнавілі свае шлюбныя клятвы.

## "Мужайцеся! Хрыстос уваскрос!"

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 17.04.2010*



**15 красавіка заўчасна, пасля доўгай хваробы памерла парафіянка гомельскага касцёла Марына Быкава. Ёй быў 21 год.**

Усе, хто яе ведаў, запомнілі Марыну сціплай, добрай, спагадлівай і мілай дзяўчынай. Нягледзячы на тое, што яна сама змагалася з цяжкай хваробай - цукровым дыябетам, яна заўсёды спяшалася на дапамогу бедным, абяздоленым, нямоглым людзям, была для іх святлом і суцяшэннем.

«На пахаванні дзяўчыны прысутнічала шмат людзей, была атмасфера падзякі Пану Богу за жыццё Марыны і яе служэнне - прыклад хрысціянскага шляху. Яе жыццёвае крэда было "Мужайцеся! Хрыстос уваскрос!". Яна часта гэта паўтарала, яна жыла гэтай Добрай Навінай. Марына ведала аб тым, што можа хутка памерці, але не баялася гэтага, таму што памятала аб сустрэчы з Уваскрэслым Ісусам Хрыстом», - падкрэсліў пробашч касцёла кс. Славамір.

Родныя і блізкія Марыны ўдзячныя ўсім людзям, якія ў цяжкую хвіліну падтрымлівалі сям'ю, маліліся за дзяўчыну.

*[Фота ў каталозе]*

## Гомельцы атрымалі благаславенне мошчамі Святога Андрэя Баболі

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 18.04.2010*



**Аднаўленнем хрысцільных клятваў завяршыліся парафіяльныя місіі, якія восем дзён праводзілі ў гомельскім касцёле браты Капуцыны. На нядзельных службах маліліся, каб сапраўды добры плён прынеслі гэтыя місіі.**

Падчас казання кс. Андрэй заўважыў, што яны далі толькі старт асаблівага шляху, прайсці які сваімі сіламі немагчыма. «Але ёсць на небе заступнікі-святыя, якія моляцца за нас, - нагадаў ксёндз. - У Евангеллі мы пачулі, як Ісус паклікаў Пятра за сабою, кажучы, якой пакутніцкай смерцю ён праславіць Бога. За Пятром былі мірыяды і мірыяды іншых. Нават не так даўно, у савецкі час, калі людзі кладліся пад экскаватары, перашкаджаючы руйнаванню храмаў. Дзякуючы пралітай крыві пакутнікаў касцёл стаіць і цяпер, і так шмат вернікаў сёння слухае Слова. Адзін з такіх пакутнікаў - польскі Святы Андрэй Баболя, які прапаведаваў тут, на нашай зямлі».

Андрэй Баболя нарадзіўся ў 1591 годзе, у юнацтве ўступіў у Ордэн Езуітаў. Аб маладым чалавеку пісалі, што ён быў вельмі гарачы, не мог схаваць праўды і заўсёды казаў прама. Андрэй Баболя меў вялікі талент да прапаведавання Слова Божага. Кіраўніцтва Ордэна хацела, каб святар застаўся ў Вільні прапаведаваць для эліты, але Гасподзь загадаў інакш. Андрэй Баболя адправіўся на Палессе, у глухія вёскі сярод лясоў і балотаў. У горадзе Іванава яго знайшла смерць. Казакі Багдана Хмяльніцкага патрабавалі, што ксёндз адрокся ад веры ў Хрыста Уваскрэсшага, але Андрэй Баболя быў цвёрды. Яго прывязалі да коня і цягнулі па зямлі. А потым збілі, вырвалі язык і знялі скуру. Такую цану Святы заплаціў за тое, каб сёння мы маглі свабодна маліцца Богу. Брат Капуцын заклікаў гамяльчан, якія адпраўляліся прапаведаваць Слова Жыцця ў родным горадзе, каб памяталі аб заступніцтве святога Андрэя Баболі.

Перад абнаўленнем хрысцільных клятваў ксёндз яшчэ раз прывёў у прыклад гісторыю Апостала Пятра. Ісус пытаўся тройчы, ці любіць ён Яго. Але толькі ў трэці раз Пётр адказаў не фармальна, а з глыбіні свайго сэрца. «Так жа і мы часта дарэмна валачэм сваё цела ў касцёл на Набажэнства, не маючы веры. Як Пётр і іншыя Апосталы неўзабаве пасля ўваскрашэння Хрыста перасталі ў гэта верыць, прызналі сябе банкрутамі і зноў адправіліся лавіць рыбу. Але ў гэты момант Ісус прыйшоў, каб умацаваць іх. Таксама і мы маем патрэбу ў аднаўленні сваёй першай хрысціянскай маладосці», - сказаў кс. Андрэй. Перад тым як зноў прамовіць Хрысцільныя клятвы, святар заклікаў вернікаў быць ля алтара не толькі ў касцёле, але і будаваць яго за хатнім сталом, на шлюбным ложку - каб зносіны з Богам зрабіць сталымі.

На нядзельных Эўхарыстыях вернікі атрымалі благаславенне мошчамі Святога Андрэя Баболі, якія ўпершыню былі прывезены ў Гомель з Янава. Пасля службаў была магчымасць прыкласціся да святых мошчаў.

*[Фота ў каталозе]*

# Травень

## Гомельскія вернікі пабывалі на сустрэчы з заснавальнікамі Неакатэхуменальнага шляху

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 03.05.2010*



**Вернікі з Гомеля, Рэчыцы і Светлагорску вярнуліся з пілігрымкі ў Польшчу, дзе 2 траўня праходзіла сустрэча з заснавальнікамі Неакатэхуменальнага шляху – руху ў Рымска-каталіцкай царкве. Іспанцы Кіка Аргуэла і Кармэн Эрнандэс правялі сход з моладдзю еўрапейскіх краін, на які прыехала больш за 10 тысяч чалавек, у тым ліку каля 100 з Гомельскай вобласці.**

Гаворка на сустрэчы ішла пра пакліканні хрысціянскай моладзі. Кіка падкрэсліў, што цяпер асабліва важна рыхтаваць і адпраўляць каталіцкіх святароў у Кітай для евангелізацыі гэтай краіны. Традыцыйна на сходзе было прапанавана юнакам і дзяўчатам падняцца на сцэну для дабраславення на манаства і святарства. З гомельскіх вернікаў знайшоўся хлопец, які ўстаў на пакліканне, а таксама дзве дзяўчыны з парафіі Нараджэння Божай Маці заявілі аб сваім намеры крочыць па манаскім шляху.

"На гэтай сустрэчы мяне асабліва ўразіла адзінства духу, якое выяўлялася ў выкананні песень на розных мовах, але гучалі яны як адзін агульны голас, - дзеліцца ўражаннямі ўдзельнік сходу, гомельскі пілігрым Іван. - А падчас усёй паездкі найбольш закранула тое, як глыбока давяраюць Богу польскія сем'і, якія нас прымалі ў сябе дома гэтых два дні. Не маючы вялікага прыбытку, яны не баяцца даваць жыццё дзецям, у той жа час не пакідаюць састарэлых бацькоў. Сапраўды жывуць для іншых".
*[Фота ў каталозе]*

## Гомельскую парафію наведалі замежныя мецэнаты, якія дапамагаюць будаваць дзіцячы хоспіс

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 16.05.2010*



**У нядзельнай Святой Імшы ў гомельскім касцёле 16 траўня ўдзельнічалі госці з Італіі (з гарадоў Аспіталетта і Падэнгэ-сул-Гарда) і аўстрыйскага горада Хард.**

Замежныя мецэнаты ўжо шмат гадоў дапамагаюць гомельскай рымска-каталіцкай парафіі, сёстрам Ордэна Маці Тэрэзы, а таксама актыўна ўдзельнічаюць у

будаўніцтве дзіцячага хоспіс для дзяцей-сірот з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця. Дзіцячая вёска ўзводзіцца ў Нававеліцкім раёне абласнога цэнтра.

Пасля Імшы перад гасцямі выступіў парафіяльны хор, как праслaвіць Госпада цудоўнымі песнямі. Пробашч храма кс. Славамір Ласкоўскі распавёў, што замежнікі прыехалі паглядзець, як ідуць справы, а таксама каб падрыхтаваць прыбыццё гуманітарнага грузу: пліткі для санвузлоў, харчовай дапамогі. «Першы этап будаўніцтва, калі ўсё будзе ўсё добра, скончым ў канцы гэтага года. Будуць гатовыя дамы для дзяцей, манастыр і адміністрацыйныя памяшканні.

Дзіцячая вёска-хоспіс разлічана на пражыванне ў ёй 60 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўмовах, максімальна набліжаных да сямейных. У такіх умовах, а таксама дзякуючы пастаянным дыдактычных і рэабілітацыйным заняткам, магчыма максімальна поўнае развіццё асобы. Праект прадугледжвае стварэнне пяці асобных груп-сем'яў, кожная з іх будзе ўключаць максімум 12 чалавек. Звяном, што злучае такую групу-сям'ю, стане сястра-законніца, якая разам з дапаможным персаналам будзе клапаціцца аб належным клімаце выхавання і атуляць апекай жыццё дзяцей.

### Гомельскае аддзяленне "Карытас" рэалізуе праграму па навучанню мове жэстаў

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 21.05.2010*

**З 10 красавіка супрацоўнікі дабрачыннай каталіцкай Місіі «Карытас - Міласэрнасць» пачалі рэалізацыю новай дабрачыннай праграмы «Зносіны без межаў», галоўная мэта якой - арганізаваць бясплатныя заняткі па вывучэнню жэставай мовы.**

Гэтыя заняткі прызначаныя для бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей з цяжкімі парушэннямі слыху і адчуваюць складанасці ў зносінах з уласнымі дзецьмі.

Штогод у Гомелі парушэнні слыху рознай ступені дыягнастуюць амаль у 2000 маленькіх хлопчыкаў і дзяўчынак ды дзяцей школьнага ўзросту. Такія дзеці маюць вялікія цяжкасці ў разуменні і абмене інфармацыяй.

Больш за палову дзяцей з парушэннямі слыху маюць бацькоў, якія не валодаюць жэставай мовай і не ведаюць, як дапамагчы свайму дзіцяці. На жаль, па розных прычынах большасць бацькоў дзяцей, якія слаба чуюць, знаёмяцца з жэставай мовай, толькі калі дзіця пачынае наведваць дзіцячы сад або школу. А гэта значыць, што на працягу ўсяго ранняга дзяцінства дзіця адчувае востры недахоп інфармацыі і камунікацыі, якія так неабходныя маленькаму чалавеку для развіцця. Часта дзіця з парушэннем слыху адчувае ізаляцыю нават ва ўласнай сям'і. Яго не разумеюць не толькі браты і сёстры, але і дарослыя члены сям'і.

Асновай для развіцця і навучання дзяцей, якія слаба чуюць, з'яўляецца жэставая гаворка. Многія недаацэньваюць яе магчымасці Сучасны слоўнік жэставай мовы налічвае больш 25 тысяч слоў. Практыка паказвае, што чым раней пачынаецца працэс навучання, тым больш паспяхова і арганічнае развіваецца дзіця.

Заняткі па вывучэнні жэставай мовы праводзяцца на базе Спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы № 70 г. Гомеля для навучэнцаў з парушэннем слыху.

Вялікую дапамогу ў рэалізацыі праграмы аказваюць бацькі-валанцёры, якія самі выхоўваюць дзяцей з парушэннямі слыху і на ўласным вопыце пераканаліся ў неабходнасці вывучэння жэставай мовы.

Бацькам, якія жадаюць далучыцца да групы па вывучэнню жэставай мовы, можна звяртацца да каардынатараў праграмы:

Прыходзька Валянціна Аляксандраўна 8-029-1234886 – маці-валанцёр

Добыш Ганна 8-029-3072996

## Дзевяць дзяцей прынялі ў Гомелі першую Камунію (ФОТА)

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 23.05.2010*



**На Пяцідзесятніцу пяць хлопчыкаў і чатыры дзяўчынкі з гомельскай парафіі Нараджэння Божай Маці ўрачыста прынялі першую Святую Камунію.**

На занятках нядзельная школы некалькі месяцаў рыхтавала дзяцей да гэтай важнай падзеі сястра Катарына з Ордэна Маці Тэрэзы. Пробашч парафіі кс. Славамір падчас казання звяртаўся да дзяцей і нагадаў, што нідзе немагчыма знайсці сапраўдную любоў, акрамя як у Пана Бога. «Памятайце, што ваш лепшы сябар, які ніколі не падвядзе, заўсёды выслухае і зразумее – гэта Ісус Хрыстос», – дадаў пробашч.

Нагадаем, у мінулым годзе першую Святую Камунію ў гомельскіх храме прымалі 22 асобы. Дарэчы, ў той раз хлопчыкаў таксама было больш. Прапануем увазе наведвальнікаў сайта фотаздымкі з сёлетняй урачыстасці.

*[Фота ў каталозе]*

## Чэрвень

### У гомельскім касцёле пачаліся сустрэчы Ананімных Алкаголікаў

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 22.06.2010*



**Па пятніцах і нядзелях у 18.00 на першым паверсе гомельскага касцёла пачалі адбывацца сустрэчы Ананімных Алкаголікаў. У групу запрашаюцца ўсе, хто хоча перастаць піць.**

«Мы таксама былі на вашым месцы», - кажуць Ананімныя Алкаголікі. Удзел у сходах бясплатны.

Карэспандэнт gomel.catholic.by сустрэўся з адным з удзельнікаў групы, алкаголікам, які не п'е ўжо амаль тры гады. Ён падзяліўся сваім вопытам.

«Я жыў у водаправодным люку, збіраў бутэлькі і харчаваўся са сметніцы. А да гэтага была турма. Пакуль я адседжваў тэрмін, пазбавіўся сям'і і дома, таму пасля вызвалення апынуўся на вуліцы, - кажа аб пачатку тыповай гісторыі наш суразмоўца, імя якога мы не называем дзеля захавання прынцыпу ананімнасці. - Жыццё для мяне не мела ніякай каштоўнасці, я страціў пашпарт, і для мяне гэта было не важна, таму што асобай я быць перастаў.

Пачуццё віны за страчанае жыццё і крыўду на ўвесь свет я глушыў алкаголем. Толькі калі быў п'яным, адчуваў смеласць, радасць і эўфарыю. Але не ведаў, да якіх мукаў мяне прывядзе злоўжыванне спіртным.

Калі я захацеў кінуць піць, сам не мог гэтага зрабіць. Не з-за таго што працягваў лавіць кайф ад алкаголю, а таму што ён быў мне неабходны як інсулін дыябетыку. Я пачаў прыходзіць у Дом міласэрнасці да сясцёр Маці Тэрэзы, там мяне кармілі і апраналі. Але я часта зрываўся, сыходзіў у запоі, і тады сёстры сказалі: «Мы не разумеем цябе і таму не можам дапамагчы. Табе дапамогуць толькі такія ж, як ты сам ». І параілі мне схадзіць на сустрэчу да Ананімных Алкаголікаў.

Я пачаў наведваць іх, але першы час не для сябе, а для сясцёр. Прыйшоў і ўбачыў за сталом сапраўды такіх жа людзей, як і я сам - алкаголікаў, але толькі цвярозых. Яны казалі пра сябе, дзяліліся сваім вопытам. І я адчуў іх сілу. Потым даведаўся, што заняткі праходзяць па сістэме 12 крокаў, якія паступова запаўняюць пустату, якая ўтварылася ў чалавека пасля адмовы ад алкаголю».

Інфармацыю аб руху можна знайсці на сайце Ананімных Алкаголікаў Беларусі.

**У Рагачове вернікі аднаўляюць касцёл да яго 100-гадовага юбілея**

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 24.06.2010*



**Рымска-каталіцкая парафія святога Антонія Падуанскага ў Рагачове пакуль нешматлікая. Відаць, адна з прычын таго – адсутнасць у райцэнтры касцёла.**

Мясцовы храм, які быў асвечаны 6 жніўня 1912 года, савецкія ўлады закрылі ў жудасны перыяд сваёй антыхрысціянскай дзейнасці. Цяпер касцёл ахутаны будаўнічымі лясамі – ўжо працяглы час вернікі намагаюцца аднавіць разбураны храм, паступова вяртаючы яму мінулую веліч і прыгажосць.

Карэспандэнты gomel.catholic.by наведалі рагачоўскую парафію і пагутарылі з яе пробашчам ксяндзом Андрэем Шутам аб гісторыі тутэйшага касцёла і працы па ягонаму адраджэнню. Прапануем чытачам сайта справаздачу аб сустрэчы і фотарэпартаж.

У 1910 годзе кс. Бернатовіч узяўся за будоўлю каменнага храма на месцы былога драўлянага. Сродкі на гэтую справу ахвяравалі чальцы Дзяржаўнай Рады і самі парафіяне. Касцёл дзейнічаў да 30-х гадоў мінулага стагоддзя, пасля ў ім быў размешчаны зернясклад, затым цэх па вырабу напіткаў і марозіва. У 1940 годзе адбыўся пажар, згарэў дах і драўляныя канструкцыі. Чорную справу дарабіла вайна: падчас вызвалення Рагачова ад фашыстаў у храм трапіла некалькі снарадаў. Пасля Перамогі ў касцёле дзяжурыў пажарны пост, затым працаваў хлебазавод. У 70-х гадах будынак зноў пачаў пуставаць. З пачаткам гарбачоўскай «перабудовы» мясцовыя краязнаўцы паспрабавалі ўзняць пытанне аб рэстаўрацыі храма, але беспаспяхова. У 2000 годзе Рагачоў наведаў кардынал Казімір Свёнтак, і касцёл быў перададзены мясцовай каталіцкай супольні. А праца па рэстаўрацыі нарэшце пачалася ў 2003 годзе.

«Зараз Святая Імша ладзіцца ў невялічкай капліцы, – распавядае цяперашні пробашч кс. Андрэй. – У нядзелю ў сярэднім прыходзіць каля 20 чалавек, але ўсіх, хто так бы мовіць «зарэгістраваўся» ў парафіі, чалавек пад сорак. Каталікоў у Рагачове даволі шмат, я яшчэ мала наведаў вёсак, у іх таксама ёсць каталікі. Большая частка – гэта прыезджыя з Заходняй Беларусі, але шмат і карэнных. Складана сказаць, колькі тут можна назбіраць каталікоў, але больш за сотню ў самім Рагачове дакладна ёсць».

На жаль, у парафіі пакуль мала моладзі, хлопцы і дзяўчыны сканчваюць школу і з'язджаюць вучыцца далей. Але ўжо пачалі з'яўляцца сужэнцы з малымі дзяцьмі. Сакрамэнтаў шлюбу ксёндз пакуль не ўдзяляў, а два хросты ўжо былі. Прыязджаюць сюды маліцца і людзі, якія маюць духоўныя праблемы.

Важную ролю ў дзейнасці пробашча займае аднаўленне мясцовага храма. Аднаму складана весці і душпастырскую працу, і будову. Кс. Андрэй прыехаў сюды тры гады таму. Дарэчы, ніякага супраціву не сустрэў, мясцовыя ўлады прынялі добра, з большасцю тутэйшых праваслаўных святароў таксама склаліся сяброўскія адносіны. Малады ксёндз родам з Баранавічаў, скончыў гродзенскую семінарыю,

пасля некалькі месяцаў быў дыяканам у Каменцы пад Брэстам. Потым служыў вікарыем у брэсцкай парафіі Ўзвіжання Святога Крыжа. Хутка быў накіраваны ў Гомельскую вобласць і стаў пробашчам у Петрыкаве, абслугоўваў некалькі парафій у самім раёне, а таксама ездзіў за шмат кіламетраў у Лунінец. А крыху болей чым праз год пераехаў у Рагачоў: з'явілася патрэба, каб тут быў асобны святар (да гэтага ў мясцовай парафіі праводзіў душпастырскую працу айцец са Жлобіна). Пакуль кс. Андрэй застаецца ў Рагачове і займаецца будоўляй касцёла, а што будзе далей – невядома, усё залежыць ад распараджэння біскупа.

«Пачалося аднаўленне касцёла ў пачатку 2000-х гадоў, былі адбудаваны муры. Але потым атрымаўся вялікі перапынак, і нават адноўленыя сцены пачалі разбурацца, бо над будынкам не было даху. Калі я прыехаў у Рагачоў, таксама не адразу ўдалося зрушыць з месца закінутую будоўлю. Толькі праз год атрымалася супольнымі сіламі накрыць дах, – кажа кс. Андрэй. – Зараз праца зноў прыпынілася з-за адной галоўнай праблемы – недахопу фінансавых сродкаў. Грошы знайсці вельмі складана, але працягваем іх шукаць. Усё фінансаванне будоўлі – гэта выключна ахвяраванні. А саму будаўнічую працу выконваюць валанцёры ў асноўным з іншых парафій, нават з Віцебскай вобласці вернікі прыязджалі на дапамогу».

У бліжэйшы час стаіць задача аднавіць амаль знішчаную вежу – тады са знешняга боку галоўная праца будзе завершана, застануцца толькі ўнутраныя работы. Рэстаўрацыя вядзецца згодна з распрацаваным архітэктурным праектам, нядаўна грамадская арганізацыя паабяцала заахвоціць да аднаўлення рагачоўскага касцёла спецыяліста, які б мог кіраваць будоўляй на валанцёрскай аснове.

«Будынак храма – гэта дом малітвы, дом Божы, і трэба яго аднаўляць у першую чаргу згодна з такімі мэтамі. Калі касцёл будзе адчынены, гэта безумоўна дазволіць пашырыць колькасць вернікаў у парафіі. Часам мы маліліся каля касцёла ці ў самім будынку, і некаторыя падыходзілі, цікавіліся. Ёсць таксама людзі, якія цяпер не наведваюць парафію, але так кажуць: калі будзе касцёл, тады пачну сюды хадзіць. Часцей за ўсё гэта адгаворка, але тым не менш – калі ёсць будынак сакральны, гэта больш прыцягвае і скіроўвае на малітву», – упэўнены пробашч.

Ксяндзу Андрэю вельмі хацелася б аднавіць касцёл да 100-годдзя яго будаўніцтва – гэта значыць да жніўня 2012 года. Але ўсё залежыць ад Пана Бога. Што тычыцца бліжэйшага часу, то ёсць намер працягнуць будоўлю хаця б напрыканцы лета або ўвосень.

*[Фота ў каталозе]*

## У гомельскім касцёле адбыўся канцэрт царкоўнага хора з Шатландыі

*Аўтар: Алена Германович*
*Дата стварэння: 26.06.2010*



**?Упершыню ў Гомелі прайшло сумеснае выступленне народнай харавой капэлы «Дзянніца» дзяржаўнага універсітэта імя Скарыны і хора капліцы універсітэта Абердзіна (Шатландыя).**

Канцэрт, прымеркаваны да 20-годдзя ўстанаўлення пабрацімскіх сувязяў паміж Гомелем і Абердзінам прайшоў у касцёле Нараджэння Божай Маці. Прагучалі нумары з «Рэквіему» Вольфганга Амадэя Моцарта, а таксама кампазіцыя Рахманінава «Багародзіца Дзева, радуйся» і рускія праваслаўныя творы. Перад пачаткам выступу пробашч парафіі ксёндз Славамір Ласкоўскі заклікаў слухачоў адкрыць свае сэрцы:

«Дазвольце увесці сябе ў той свет, які Бог падараваў нам. Зараз мы пачуем тое, што было створана пад уплывам Божага Духа».

Канцэрт прайшоў пры аншлагу, гледачы развітваліся са спевакамі бурнымі авацыямі. Кіраўнікі гомельскага і абердынскага калектываў выказалі найлепшыя пажаданні пробашчу парафіі і падзякавалі за прадастаўленне памяшкання касцёла – па акустычных уласцівасцях адной з лепшых у горадзе залаў для харавога спеву.

Хор капліцы Абердзінскага універсітэта - адзін з найстарэйшых музычных калектываў Шатландыі. Яго ўдзельнікі - паслядоўнікі хора вікарыяў, заснаванага ў канцы 15 стагоддзя. Сучасны хор капліцы складаецца з 30 спевакоў, ён быў заснаваны ў 1891 годзе для спеваў на універсітэцкіх службах, якія ў цяперашні час праводзяцца штотыдзень. На сённяшні дзень Капліца Абердзінскага універсітэта з'яўляецца адзінай сярэднявечнай капліцай для пастаянных службаў. Рэпертуар хору разнастайны: ад сярэднявечнай музыкі да сучасных твораў, некаторыя з якіх былі адмыслова напісаныя для хору. Кіраўнік і дырыжор калектыву – магістр капэлы, доктар філасофскіх навук, кампазітар і арганіст Роджэр Уільямс.

Народная харавая капэла «Дзянніца» была створана ў 1988 годзе. Калектыў вядзе актыўную канцэртна-асветніцкую дзейнасць з мэтай папулярызацыі помнікаў беларускага і рускага музычнага мастацтва XVII-XVIII стагоддзяў. У цяперашні час у складзе хору 30 чалавек: выкладчыкі і студэнты універсітэта, аматары харавога спеву. Капэла з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх конкурсаў і фестываляў.

*[Фота ў каталозе]*

## Відэа з хрышчэння ў гомельскім касцёле

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 27.06.2010*



**На мінулых нядзельных Набажэнствах яшчэ тры маленькіх чалавека ачысціліся ад першароднага граху сакрамэнтам хрышчэння.**

Гэта Макар, сын Аляксандра і Кацярыны Мякшынавых, Раман – другое дзіцятка ў сям'і Вячыслава і Таццяны Барычэўскіх, і Аляксандр – першынец Мікалая і Марыі Казубенка.

– Для нас сённяшні дзень вельмі важны, таму што хрышчэнне ўводзіць у Царкву, якой мы верым, якая захоўвае праўду. Яшчэ ні разу Бог, Ісус Хрыстос не падмануў мяне праз сваё Слова, праз тое, што кажа святар, – сведчыць малады тата Мікалай. – Таму хрэсцім дзіця, каб яно ўзрастала ў Царкве, мела жыццё вечнае і йшло да выратавання. Прыносім сына, каб аддаць яго Богу, хай Ён зробіць з ім тое,

што лічыць патрэбным. З'яўленне сына залежыла не ад мяне, не ад маёй жонкі, а менавіта Гасподзь зрабіў гэты цуд.
*[Фота ў каталозе]*
*[Відэа глядзіце на канале https://www.youtube.com/user/nusmumrikLJ]*

## Ліпень

### У Будслаўскіх урачыстасцях удзельнічалі 50 гомельцаў (ФОТА)

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 03.07.2010*



**Самыя смелыя парафіяне гомельскага касцёла – тры школьніцы Разарыя, Крысціна і Вераніка – адправіліся ў пешую пілігрымку да Будслава з Мінска.**

Разам з яшчэ чатырма сотнямі каталікоў юныя гамяльчанкі праходзілі па 20-30 кіламетраў у суткі, у выніку дайшоўшы да Будслава за пяць дзён. «У дарозе мы спявалі песні і маліліся. Пешае паломніцтва дае вельмі моцны зарад Святога Духа, галоўнае зараз – не згубіць яго, як казаў наш святар. Пасля гэтага падарожжа сэрцы напоўніліся вялікай радасцю, асабліва запомнілася, як мы са свечкамі шматтысячнай сям'ёй ўдзельнічалі ў начным набажэнстве», – падзяліліся ўражаннямі дзяўчынкі.

Яшчэ каля пяцідзесяці гомельцаў адправіліся ў Будслаў на аўтобусе, многія ехалі на гэтае свята ўпершыню. І ў першы раз вернікі парафіі Нараджэння Божай Маці ўдзельнічалі ў начной Святой Імшы.

«Я ездзіў у Будслаў ужо ў трэці раз, у гэтым годзе вырашыў туды адправіцца дзеля свайго навяртання, каб Бог мяне вёў за сабою. Найбольш уразіла пачутае там Слова, якое я вельмі хацеў пачуць, і якое накіравала мяне на шлях да Бога», - кажа малады парафіянін Іван, што ездзіў у пілігрымку разам з жонкай.

Шкада, што ў гэты раз ўрачыстасці Маці Божай Будслаўскай прапусціў беларускі кардынал Казімір Свёнтэк. Ён да гэтага часу знаходзіцца ў шпіталі, дзе далечваецца пасля перанесенай аперацыі.

Каля 17 тысяч чалавек сабраліся сёлета ў Будславе, з іх больш за дзве з паловай тысячы прыйшлі з розных гарадоў пешшу. Больш падрабязна пра гэта чытайце на сайце catholic.by, там жа размешчаны фотарэпартаж.

А гэтыя здымкі даслаў Аляксандр Забароўскі:
*[Фота ў каталозе]*

### У Гомелі завяршаецца будаўніцтва дзіцячай вёскі для сірот-інвалідаў

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 04.07.2010*



**У лістападзе 2010 года плануецца здаць у эксплуатацыю першую чаргу дзіцячага хоспіса для сірот-інвалідаў, будаўніцтвам якога займаецца дабрачынная каталіцкая місія «Карытас – Міласэрнасць».**

Мяркуецца, што ў новыя камфартабельныя дамы

дзеці з Журавічскага інтэрната будуць заселеныя ў пачатку наступнага года. Вёска будуецца ўжо амаль шэсць гадоў у Навабеліцкім раёне Гомеля на ахвяраванні прыватных асоб з краін Заходняй Еўропы.

Каб паглядзець, як ідзе ўзвядзенне хоспіса і вызначыць далейшыя крокі, 4 ліпеня будаўнічую пляцоўку ў Гомелі наведалі галоўныя спонсары праекта, якія клапоцяцца аб яго фінансаванні, пералічваючы ўласныя сродкі і збіраючы ахвяраванні.

Гэта Пітэр Вурм і Зігрыд Шпіндлбек-Лугер з аўстрыйскай арганізацыі «Карытас – Лінц», Марцін Лорэнц з нямецкай дабрачыннай каталіцкай арганізацыі «Renovabis» і Дорыс Альгоір з горада Харт у Аўстрыі. Таксама ў Гомель прыехала сястра Марыя, якая ўзначальвае Ордэн Бенедыктынак-Самарыцянак у польскім горадзе Негув, і некалькі сясцёр.

Хоспіс разлічаны на пражыванне ў ім 60 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўмовах, максімальна набліжаных да сямейных. У такім асяроддзі, а таксама дзякуючы пастаянным дыдактычным і рэабілітацыйным заняткам, магчыма максімальна поўнае развіццё асобы. Праект прадугледжвае стварэнне пяці асобных груп-сем'яў, кожная з іх будзе ўключаць максімум 12 чалавек. Звяном, якое злучае такую групу сям'ю, стане сястра-законніца, якая разам з дапаможным персаналам будзе клапаціцца аб належным клімаце выхавання і ахоўваць апекай жыццё дзяцей. Даглядаць за сіротамі-інвалідамі будуць сёстры Ордэна Бенедыктынак-Самарыцянак Крыжа Хрыстовага, дзейнасць хоспіса будзе арганізавана пры непасрэдным удзеле і падтрымцы абласнога камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва.

*[Фота ў каталозе]*

## Міністранты гомельскага касцёла здзейснілі падарожжа па Беларусі

*Аўтар: ул. інф.*

*Дата стварэння: 18.07.2010*



**Падчас летніх вакацыяў пробашч гомельскага касцёла зладзіў для міністрантаў парафіі пілігрымку-экскурсію па Паўднёвай і Заходняй Беларусі.**

На працягу пяці дзён хлопцы разам з ксяндзом Славамірам падарожнічалі на машыне па выдатных мясцінах нашай рэспублікі. Аб паездцы і аб сваіх уражаннях распавядае Віктар Рэпчанка.

– Спачатку мы заехалі ў Калінкавіцкі раён у вёску Юравічы, дзе раней быў касцёл езуітаў, а потым ён быў перададзены праваслаўным. Зараз будынак рэстаўруецца, хутка пачнуць крыць дах. Потым накіраваліся ў Пінск, у семінарыю. Падчас экскурсіі нам распавялі, як жылі манахі (раней тут быў манастыр) і чым жывуць цяперашнія семінарысты, як вучацца, што робяць у вольны час. У пінскай семінарыі я быў у другі раз. Упершыню мне тут было не па сабе: не мог зразумець, як можна жыць у такой строгасці, бо прывык да іншага: гуляць, быць

прадастаўленым самому сабе. Зараз было не так страшна: убачыў, што людзі жывуць з Богам і аддаюцца яму цалкам.

Затым мы трапілі ў Лагішын, дзе знаходзіцца абраз Маці Божай Каралевы Палесся, ксёндз распавёў гісторыю гэтай іконы, мы памаліліся перад ёй. Потым адправіліся ў Янава – месца пакутніцкай смерці святога Андрэя Баболі. У тутэйшым касцёле знаходзіцца крыж, які вырабіў вядомы беларускі мастак Напалеон Орда. Таксама пабывалі ў яго музеі. Дзякуючы малюнкам таленавітага майстра мы можам меркаваць аб тым, якой прыгожай была Беларусь - бо многія старажытныя будынкі да нашых дзён не захаваліся.

Таксама пабывалі ў Баранавічах у айцоў-вярбістаў. Там затрымаліся на некалькі дзён, дзякуючы гэтаму змаглі аб'ездзіць наваколлі горада. У вёсцы Ішкальдзь ўбачылі самы старажытны ў Беларусі касцёл - храм Найсвяцейшай Тройцы, які быў пабудаваны у 1472 годзе. Даведаліся, што святар гэтага касцёла загінуў пакутніцкай смерцю ад рук камуністаў. Яны патрабавалі, каб ксёндз адрокся ад каталіцкай веры, ад Бога, але ён гэтага не зрабіў. Тады святару адсеклі галаву і ўтапілі ў калодзежы. Толькі праз паўгода вернікі змаглі дастаць цела і пахаваць яго. У суседняй вёсцы Паланечка ўбачылі адзін з самых старажытных у Беларусі драўляных касцёлаў, якому ўжо больш за 200 гадоў.

Потым пабывалі на экскурсіях ў Нясвіжскім і Мірскім замках. Далей заехалі ў Слонім і сустрэліся з ксяндзом Андрэем, які праводзіў парафіяльныя місіі ў Гомелі. У райцэнтры касцёл зараз рэстаўруецца, але па-ранейшаму знаходзіцца ў жудасным стане, таму што пры бальшавіках будынак выкарыстоўваўся як солесховішча, у сцены ўелася соль, яна і зараз працягвае разбураць касцёл і знішчаць старажытныя фрэскі.

Апошнім пунктам нашага падарожжа стаў Наваградак - сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Там мы пабывалі ў музеі-сядзібе Адама Міцкевіча, пагутарылі з дырэктарам. Ён вельмі цікава, з запалам, распавядаў нам пра жыццё паэта, пра гісторыю краю. Мы з захапленнем слухалі, таму што аповяд быў не такім, як у нашых падручніках гісторыі, а вельмі жывым і захапляльным.

Таксама пабывалі ў Навагрудскім Фарным касцёле, дзе пахаваны 11 сясцёр-назарэтанак. Манашкі былі расстраляныя фашыстамі ў 1943 годзе. Напярэдадні захопнікі арыштавалі больш за 120 мірных жыхароў і хацелі іх забіць. Але сёстры дарагой цаной выкупілі людзей - аддалі за іх свае жыцці. Каля саркафага з целамі манашак-пакутніц мы памаліліся. Мабыць, гэты момант мяне ўразіў за ўсю паездку больш за ўсё. Таму што тут, каля праха сясцёр, я адчуў прысутнасць Божага Духа.

У цэлым, я вельмі ўражаны паездкай. Нават не меркаваў, што ў нас ёсць такія выдатныя касцёлы, што наша гісторыя настолькі багатая. І проста ўзрушаны прыгажосцю роднай зямлі.

*[Фота ў каталозе]*

**Бернардынцы з Літвы распішуць галоўную ікону гомельскага касцёла**

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 27.07.2010*



**Пробашч гомельскай парафіі Нараджэння Божай Маці вярнуўся з Літвы, дзе быў у кляштары айцоў-бернардынцаў. Менавіта яны вырабілі іконы Крыжовага шляху ў гомельскім касцёле.**

І вось зараз дасягнута дамоўленасць аб тым, каб распісаць алтарную частку і галоўную ікону – на белай сцяне за алтаром, дзе зараз знаходзіцца абраз Маці Божай Чэнстахоўскай, з'явіцца вялікая фрэска.

«Літоўскія госці распішуць карціну Нараджэння Божай Маці, таксама будуць намаляваныя аблічча святога Андрэя і святога Пятра, каб паказаць адзінства Цэркваў Усходу і Захаду. Пакуль невядома, калі дакладна пачнуцца работы, але ёсць надзея паспець да бліжэйшага Вялікадня. Тады касцёл, нарэшце, больш-менш набудзе той выгляд, які быў першапачаткова задуманы», – адзначыў кс. Славамір.

## Жнівень

### Сёстры Маці Тэрэзы праводзяць у Гомелі лагер для дзяцей

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 04.08.2010*



**Штогадовы лагер для дзяцей «Канікулы з Богам» адкрыўся ў Доме міласэрнасці сясцёр Ордэна Маці Тэрэзы.**

Першая група складаецца з больш за 40 маленькіх гомельцаў узростам з 5 да 13 гадоў. З 9 жніўня Дом міласэрнасці будзе прымаць другую групу – запісацца яшчэ не позна.

Як распавяла сястра Катарына, якая займаецца арганізацыяй лагера, дзеці не толькі гуляюць, атрымліваюць добрае харчаванне, але і прымаюць удзел у малітвах. Традыцыйна дапамогу ў рабоце аказваюць італьянскія валанцёры, якія прыехалі з горада Брэна, што ў рэгіёне Ламбардыя. У гэтым годзе лагеру дапамагаюць 7 гасцей: гэта Джакаба, Марціна, Таня, Люка, Антэя, Франчэско і Франчэска. Маладыя людзі – парафіяне касцёла ў сваім горадзе. Некаторыя з іх прыехалі ў Гомель ўпершыню, а хтосьці ўжо ў чацвёрты раз. На працягу 20 дзён італьянцы будуць гуляць, рыхтаваць для дзяцей ежу і прыбіраць за імі. «Валанцёры не гавораць па-руску і дзеці таксама не ведаюць італьянскай, але разумеюць яны адзін аднаго выдатна, таму што размаўляюць на агульнай для ўсіх мове любві», – адзначыла сястра Катарына.
*[Фота ў каталозе]*

### У гомельскім касцёле моляцца аб ніспасланні дажджу

*Аўтар: Алена Германович*
*Дата стварэння: 08.08.2010*



**8 жніўня падчас Святой Імшы вернікі звярталіся да Бога аб ніспасланні дажджу ў старажытнай малітве Суплікацыі.**

Яна з'явілася ў 18 стагоддзі – у гэтай малітве Царква шукала абароны ў Бога ад войнаў, голаду, эпідэмій, паводак і пажараў.

Пробашч гомельскай парафіі нагадаў вернікам аб лясных пажарах і іх цяжкіх наступствах для людзей і экалогіі ў Расіі і аб анамальнай спёцы, якая усталявалася у Гомельскай вобласці. Святар заклікаў людзей маліцца аб дажджы штодня, а таксама выбраць два дні ў тыдні для строгага паста, каб умацоўваць зварот да Бога.

«Чаму прыйшла гарачыня – не ведаю. Але гэта факт, які дапускае Гасподзь. Такія катаклізмы паказваюць, што мы вельмі слабыя, не трымаем свой лёс ва ўласных руках, не можам нічога змяніць – гэта вучыць чалавека пакорлівасці перад

Творцам. Многія людзі жывуць так, як быццам Бога няма, можа быць, для іх гэтая спякота стане часам разумення свайго лёсу, свайго жыцця і таго, што трэба трымацца Госпада і яго запаведзяў», – адзначыў пробашч.

## У Гомелі пачалі святкаваць 100-годдзе нараджэння Маці Тэрэзы

*Аўтар: Павал Міцкевіч*
*Дата стварэння: 15.08.2010*



**26 жніўня спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Агнэсы Гонджа Баяджыу, вядомай ўсяму свету як Маці Тэрэза.**

У гэты дзень а 11 гадзіне ў гомельскім касцёле пачнецца ўрачыстае Набажэнства з удзелам дапаможнага біскупа Пінскай дыяцэзіі Казіміра Велікасельца. У Гомелі юбілей дабрадзейкі будуць адзначаць з асаблівай цеплынёй: бо гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе працуе Дом міласэрнасці сясцёр Ордэна Маці Тэрэзы.

Сёстры не любяць казаць аб сваёй дзейнасці, але галоўнае, што іх справы бачыць Бог. Круглы год ужо на працягу амаль 20 гадоў законніцы дапамагаюць бедным і бяздомным людзям, кормяць іх, апранаюць, даглядаюць за хворымі. Таксама сёстры рэгулярна ладзяць сустрэчы і летнія лагеры для дзяцей з бедных і шматдзетных сем'яў.

Першае ўрачыстае мерапрыемства да юбілея стваральніцы Ордэна прайшло ў гомельскім касцёле 15 жніўня. Пасля нядзельнай Святой Імшы дарослыя і маленькія парафіяне паказалі сцэнку аб жыцці Маці Тэрэзы.

